Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар
______________ А.І.Жук
“ 17 ” 04 2024 г.

Рэгістрацыйны № УД-91-2-78 /вуч.

# СТЫЛІСТЫКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:

**1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура**
**1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура (з указаннем мовы)**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021, (20.04.2022, №85), АСВА 1-02 03 03-2021, (20.04.2022, № 85), вучэбных планаў спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура (15.07.2021, № 048 – 2021/у; 23.06.2022, № 133 – 2022/у); 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) (15.07.2021, № 050 – 2021/у; 23.06.2022, № 134 – 2022/у); 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская) (15.07.2021, № 051 – 2021/у; 23.06.2022, № 135 – 2022/у)

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Т.Я.Старасценка, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

В.І.Іўчанкаў, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;
Т.У.Ганчарова-Цынкевіч, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія № 18 г. Мінска імя І.С.Міранкова" ________ Ю.В.Новік

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 8 ад 20.03. 2024 г.)

Загадчык кафедры ________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 6 ад 16.04 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела ________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ________ Н.П.Сяткоўская

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Стылістыка" прызначана для рэалізацыі на ўзроўні агульнай вышэйшай адукацыі ў межах модуля "Сучасная беларуская літаратурная мова – 4" (дзяржаўнага кампанента). Ад папярэдняга тыпу вучэбнай праграмы яе адрозніваюць абноўлены змест, арыентацыя на кампетэнтнасны падыход у навучанні, значнае ўзмацненне ролі і часткі самастойнай работы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій.

Вучэбная дысцыпліна "Стылістыка" знаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі стылістыкі беларускай мовы, стылістычнымі памылкамі і спосабамі іх выпраўлення, спецыфікай аналізу тэкстаў розных стыляў, падстыляў, жанраў, асаблівасцямі стварэння вусных і пісьмовых тэкстаў. Тэарэтычныя і практычныя веды, набытыя студэнтамі пры вывучэнні курса, адыгрываюць важную ролю ў прафесійнай падрыхтоўцы настаўніка-філолага: стылістыка вучыць адбіраць з усяго арсеналу мовы тыя сродкі, неабходнасць ужывання якіх абумоўлена пэўнымі экстралінгвістычнымі фактарамі.

Пры вывучэнні стылістыкі беларускай мовы прадугледжваецца яе пераемнасць і сувязь з іншымі лінгвістычнымі прадметамі (сучаснай беларускай літаратурнай мовай, гісторыяй беларускай літаратурнай мовы, культурай беларускага маўлення і інш.).

**Асноўныя мэты выкладання дысцыпліны:**

− развіць і ўдасканаліць лінгвістычную кампетэнцыю студэнта ў аналізе моўных фактаў тэкстаў розных стыляў і жанраў;

− сфарміраваць устаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

− выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа і іншых славянскіх народаў у гістарычным кантэксце.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны "Стылістыка"**:

– даць навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя веды па асноўных паняццях стылістыкі;

– пазнаёміць студэнтаў з рознымі поглядамі вучоных на вылучэнне стыляў, падстыляў, жанраў;

– раскрыць заканамернасці ўжывання беларускіх моўных сродкаў у залежнасці ад экстралінгвістычных фактараў ;

– сфарміраваць устойлівыя навыкі стылістычнага аналізу моўных фактаў у тэкстах розных стыляў і жанраў;

– развіць і ўмацаваць навыкі практычнага выкарыстання тэарэтычных ведаў пры аналізе тэкстаў.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.* Сярод лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь, "Стылістыка" займае адно з найважнейшых месцаў у

сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў. Гэта самастойная лінгвістычная дысцыпліна, якая мае свой прадмет вывучэння, метады і прыёмы аналізу.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.* Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь з наступнымі вучэбнымі дысцыплінамі "Гісторыя беларускай мовы", "Культура беларускага маўлення".

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Стылістыка" студэнт павінен:

**ведаць:**

– асноўныя паняцці стылістыкі;

– моўную спецыфіку функцыянальных стыляў беларускай мовы;

– асаблівасці лексічнай, марфалагічнай і сінтаксічнай стылістыкі;

– навуковую літаратуру па стылістыцы.

**умець**:

– выконваць стылістычны аналіз тэкстаў розных функцыянальных стыляў і лінгвістычнае каменціраванне мастацкіх тэкстаў;

– ствараць самастойныя тэксты;

– праводзіць стылістычную праўку тэкстаў розных стыляў;

– кваліфікаваць і выпраўляць памылкі вучняў.

**валодаць:**

– навыкамі крытычнага аналізу найбольш складаных з'яў стылістыкі беларускай мовы;

– навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі;

– уменнем ствараць самастойныя тэксты розных стыляў і жанраў.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Стылістыка" павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў базавых прафесійных кампетэнцый. Для спецыяльнасці 1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы) **БПК-17**: Улічваць пры аналізе літаратурных твораў метадалагічныя асновы беларускай літаратурна-крытычнай думкі, умоў яе станаўлення і развіцця, для спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура **БПК-21**: Улічваць стылістычны патэнцыял фанетычных, лексічных, граматычных, дыскурсіўна-тэкставых парадыгмаў беларускай мовы, яе функцыянальна-стылістычныя і стылёвыя разнавіднасці.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне "Стылістыка" студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

*Структура зместу вучэбнай дысцыпліны*

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Найбольш перспектыўныя і эфектыўныя сучасныя інавацыйныя адукацыйныя сістэмы і тэхналогіі наступныя: вучэбна-метадычны комплекс, блочна-модульная, модульна-рэйтынгавая і крэдытная сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае ўводзіны і вучэбныя раздзелы (тэмы). Тэматычны змест вучэбнай дысцыпліны рэалізуецца ў наступных формах: практычныя заняткі, самастойная праца студэнтаў.

Вучэбная дысцыпліна на дзённым аддзяленні чытаецца на 4 курсе ў 7-м семестры. У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Стылістыка” ўсяго адводзіцца 96 вучэбных гадзін, з якіх 48 – аўдыторныя (24 гадзіны – лекцыі, 24 гадзіны – практычныя) і 48 гадзін – самастойная праца.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая. Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

*Размеркаванне гадзін на 4курсе*

| се-<br>местр | усяго<br>гадзін | аўдытор-<br>ныя | лекцый-<br>ныя | прак-<br>тычныя | самаст.<br>работа | форма<br>кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7 | 96 | 48 | 24 | 24 | 48 | залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**1. Уводзіны.**

***1.1. Стылістыка як лінгвістычная дысцыпліна.*** Стылістыка, яе змест і задачы. Месца курса “Стылістыка” ў сістэме лінгвістычных і нелінгвістычных дысцыплін (сувязь курса з лексікалогіяй, фразеалогіяй, арфаэпіяй, граматыкай, гісторыяй беларускай літаратурнай мовы, лінгвістычным аналізам тэксту; літаратурай, філасофіяй, гісторыяй і інш.). Стылістыка і культура маўлення, іх падабенства і адрозненне. З гісторыі станаўлення стылістыкі як самастойнай лінгвістычнай дысцыпліны. Вывучэнне стылістыкі ў беларускай філалогіі. Асноўныя напрамкі сучаснай стылістыкі. Стылістыка мовы, стылістыка маўлення, стылістыка мастацкай літаратуры. Стылістыка тэксту. Стылістыка дэкадавання. Прыёмы вылучэння сэнсавых момантаў твора ў стылістыцы дэкадавання (канвергенцыя, счапленне, эфект падманутага чакання). Метады і прыёмы стылістычнага аналізу (семантыка-стылістычны, параўнальны, статыстычны; аналіз па слоўнікавых паметах, аналіз слова ў кантэксце, стылістычны эксперымент).

***1.2. Асноўныя паняцці стылістыкі.*** Асноўныя паняцці стылістыкі (стыль, стылістычная сістэма, стылістычная норма, стылістычная афарбоўка і інш.). Стылістычныя памылкі, іх адрозненне ад памылак сэнсавых, лексічных, граматычных. Сувязь стылістычных памылак з паняццямі матываванасці, нематываванасці. Разнавіднасці стылістычных памылак (выкарыстанне кніжнай і гутарковай лексікі ў вузкім кантэксце; тэрміналогіі, канцылярызмаў у неспецыяльных тэкстах; недарэчнай вобразнасці; моўных штампаў і плеаназмаў; немілагучных выразаў). Паняцце функцыянальнага стылю. Прынцыпы вылучэння стыляў (сацыяльны, жанравы, функцыянальны і інш.). Тэорыя “трох стыляў”. Стылістычная сістэма мовы. Паняцці стылю, падстылю і жанру. Функцыянальны стыль як незамкнёная сістэма моўных сродкаў.

**2. Афіцыйна-справавы стыль.** З гісторыі развіцця афіцыйна-справавога стылю. Сфера выкарыстання афіцыйна-справавога стылю (афіцыйнае справаводства), форма зносін (пісьмовая і вусная маналагічная), мэта (выражэнне волі, загад, канстатацыя), характар узаемаадносін (афіцыйны). Функцыі афіцыйна-справавога стылю (паведамлення і ўздзеяння).Падстылі і жанры афіцыйна-справавога стылю (заканадаўчы: закон, канстытуцыя, указ і інш., дыпламатычны: камюніке, мемарандум, міжнародны дагавор і інш., адміністрацыйна-канцылярскі: заява, аб’ява, даверанасць, распіска, характарыстыка і інш.).Асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю на лексічным узроўні. Адсутнасць эмацыянальных, суб’ектыўна ацэначных і гутарковых слоў. Ужыванне абстрактнай, тэрміналагічнай, спецыяльнай лексікі, абрэвіятур. Наяўнасць спецыфічных тэматычных груп (назваў асоб па іх функцыі ў афіцыйных зносінах, назваў дакументаў, іх частак, структуры,

абазначэнняў службовых працэдур па ўзгадненні і зацвярджэнні, а таксама канцылярызмаў, устарэлай (архаічнай) лексікі). Асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю на марфалагічным узроўні. Наяўнасць іменных часцін мовы. Ужыванне аддзеяслоўных назоўнікаў з адмоўем і без яго, імператыўных дзеясловаў (форма загаднага ладу, форма інфінітыва са значэннем загаду). Пашыранасць адыменных прыназоўнікаў і састаўных злучнікаў. Асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю на сінтаксічным узроўні. Структура кампазіцыйных канструкцый (раздзелы, параграфы, пункты, падпункты). Сродкі вылучэння тэкставых сегментаў афіцыйных тэкстаў (арабскія лічбы, абзац, працяжнік). Ужыванне спецыфічных устойлівых словазлучэнняў, стандартных канструкцый, дзеяслоўных словазлучэнняў (дзеяслоў+назоўнік) замест дзеясловаў, безасабовых, інфінітыўных канструкцый са значэннем імператыўнасці, сказаў ускладненай будовы, складаных сказаў. Стылістычныя памылкі пры афармленні афіцыйных папер. Стылістычная праўка тэкстаў афіцыйна-справавога стылю. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў афіцыйна-справавога стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў. Аналіз тэкстаў афіцыйна-справавога стылю.

**3. Навуковы стыль.** З гісторыі развіцця навуковага стылю. Сфера выкарыстання (навука, вытворчасць, адукацыя), форма зносін (пісьмовая і вусная маналагічная), мэта (паведамленне інфармацыі), характар узаемаадносін (афіцыйны). Спецыфіка інфармацыйнай функцыі навуковага стылю. Падстылі і жанры навуковага стылю (уласна навуковы: манаграфія, дысертацыя, аўтарэферат і інш., навукова-вучэбны: падручнік, лекцыя, семінарскі даклад і інш., навукова-папулярны: выступленне, дапаможнік, артыкул і інш.). Асаблівасці тэкстаў навуковага стылю на лексічным узроўні. Асноўныя групы лексікі навуковага стылю (нейтральныя словы і выразы, словы агульнанавуковага ўжывання, вузкаспецыяльная і агульнанавуковая тэрміналогія). Адметнасці лексічных сродкаў тэкстаў навукова-папулярнага падстылю (тропы, гутарковыя словы). Асаблівасці тэкстаў навуковага стылю на марфалагічным узроўні. Ужыванне абстрактных назоўнікаў, формаў роднага склону, адзіночнага і множнага ліку назоўнікаў. Выкарыстанне прыметнікаў у састаўных тэрмінах. Наяўнасць формаў цяперашняга часу дзеясловаў (цяперашні пазачасавы), 1-й асобы множнага ліку. Пашыранасць вытворных прыназоўнікаў. Асаблівасці тэкстаў навуковага стылю на сінтаксічным узроўні. Выкарыстанне ўскладненых і складаных сінтаксічных канструкцый, пасіўных адзінак. “Расшчапленне” выказніка. Перавага злучнікавых сказаў над бяззлучнікавымі. Рэалізацыя сэнсавай сувязі паміж сказамі навуковых тэкстаў (лексічны і сінанімічны паўторы). Стылістычныя памылкі ў тэкстах навуковага стылю. Стылістычная праўка тэкстаў навуковага стылю. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў навуковага стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў. Аналіз тэкстаў навуковага стылю.

**4. Публіцыстычны стыль.** З гісторыі развіцця публіцыстычнага стылю. Сфера выкарыстання (грамадска-палітычная, культурная, спартыўная), форма зносін (пісьмовая ці вусная маналагічная, пісьмовая ці вусная дыялагічная),

мэта, характар узаемаадносін (афіцыйны), функцыі публіцыстычнага стылю. Падстылі публіцыстычнага стылю (газетна-публіцыстычны, радыё- і тэлежурналісцкі, аратарскі). Жанры публіцыстычнага стылю (інфармацыйныя: справаздача, рэпартаж, інтэрв'ю і інш., аналітычныя: карэспандэнцыя, рэцэнзія, агляд і інш., мастацка-публіцыстычныя: нарыс, эсэ, фельетон і інш.). Жанравая мадыфікацыя тэкстаў публіцыстычнага стылю. Адрозненне тэкстаў публіцыстычнага і мастацкага стыляў. Асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю на лексічным узроўні. Стандарт і экспрэсія ў публіцыстычных тэкстах. Роля функцыі паведамлення ў фармаванні нейтральнай лексікі і моўных штампаў. Роля функцыі ўздзеяння ў фармаванні ацэначнай лексікі. Наяўнасць грамадска-палітычнай лексікі. Асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю на марфалагічным узроўні. Выкарыстанне абстрактных аддзеяслоўных назоўнікаў, адцягненых назоўнікаў у форме множнага ліку без абазначэння колькасці, дзеясловаў загаднага ладу. Асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю на сінтаксічным узроўні. Ужыванне сегментаваных і ўводных канструкцый, парцэляцыі, намінатыўных і эліптычных сказаў, інверсаванага парадку слоў. Стылістычныя памылкі ў тэкстах публіцыстычнага стылю. Стылістычная праўка тэкстаў публіцыстычнага стылю. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў публіцыстычнага стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў. Супастаўляльна-стылістычны аналіз нарыса і мастацкага тэксту. Напісанне эсэ, нататкі, карэспандэнцыі. Аналіз тэкстаў публіцыстычнага стылю.

**5. Мастацкі стыль.** З гісторыі развіцця мастацкага стылю. Пытанне пра стылявы статус мастацкага стылю ў лінгвістыцы. Уплыў мастацкага стылю на іншыя функцыянальныя стылі. Уплыў усіх функцыянальных стыляў на мову мастацкага твора. Сфера выкарыстання мастацкага стылю (эстэтычная), форма зносін (дыялагічная і маналагічная пісьмовая), мэта (сацыяльна-эстэтычнае ўздзеянне), характар узаемаадносін (неафіцыйны). Спецыфіка эстэтычнай функцыі мастацкага стылю. Падстылі і жанры мастацкага стылю (паэтычны: верш, паэма і інш., празаічны: апавяданне, аповесць і інш., драматургічны: камедыя, трагедыя і інш.). Асаблівасці мастацкага стылю (экспрэсіўнасць, эмацыянальнасць, вобразнасць). Роля гукавой арганізацыі твора ў стварэнні вобраза. Класіфікацыя гукапісных элементаў (простыя гукавыя паўторы, ускладненыя гукавыя паўторы, складаныя гукавыя паўторы). Роля тропаў (метафар, метанімій, сінекдах, эпітэтаў, параўнанняў, гіпербал, літот і інш.) у фармаванні мастацкага вобраза. Трыяда мастацкага вобраза (вобраз-індыкатар, вобраз-троп, вобраз-сімвал). Сродкі стварэння вобразнасці (сінонімы, антонімы, адметнае спалучэнне моўных адзінак і інш.). Трансфармацыя моўных адзінак у кантэксце мастацкага твора. Камбінаторнае прырашчэнне сэнсу. Празаічная і паэтычная арганізацыя мастацкага тэксту. Класічная і арнаментальная проза. Празаізацыя вершаванага тэксту і сродкі яе выражэння (дыялагізацыя, словы бытавога зместу і інш.). Паэтызацыя празаічнага тэксту і сродкі яе выражэння (індывідуальна-аўтарскія вобразы, стылістычна афарбаваныя словы і інш.). Асаблівасці сінтаксічнай арганізацыі аўтарскага маўлення і маўлення персанажаў. Сродкі паэтычнага сінтаксісу (анафара, эпіфара, кальцо,

паралелізм, градацыя і інш.). Праблема індывідуальнага стылю пісьменніка. Аналіз тэкстаў мастацкага стылю.

**6. Канфесійны стыль.** З гісторыі развіцця канфесійнага стылю. Сфера выкарыстання канфесійнага стылю (рэлігійная літаратура), форма зносін (маналагічная пісьмовая), мэта (эмацыянальнае ўздзеянне), характар узаемаадносін (афіцыйны). Спецыфічныя асаблівасці канфесійнага стылю (абагульненасць, дакладанасць, лагічнасць выкладу). Жанры кананічнай, царкоўна-рэлігійнай, рэлігійна-бытавой літаратуры (псалмы, прадмовы, пасляслоўі, акафісты і інш.). Моўныя асаблівасці тэкстаў канфесійнага стылю. Наяўнасць адметных метафарычных зачынаў, вобразных сродкаў мовы, спецыфічнай лексікі. Шырокае выкарыстанне прытчаў. Ужыванне дзеепрыслоўных зваротаў, прыёмаў нанізвання простых сказаў і адмаўлення праз адмаўленне.

**7. Размоўны (гутарковы) стыль.** Месца размоўнага стылю ў сістэме функцыяльных стыляў. Сфера выкарыстання размоўнага стылю (бытавая), форма зносін (дыялагічная і маналагічная), мэта (камунікацыя), характар узаемаадносін (неафіцыйны). Жанры размоўнага стылю (асабістае пісьмо, гутарка, тэлефонная размова, дзённік і інш.). Асаблівасці тэкстаў размоўнага стылю на лексічным узроўні. Ужыванне нелітаратурных моўных адзінак (прастамоўнай лексікі, дыялектызмаў, прафесіяналізмаў, жарганізмаў), метафар, заснаваных на пераносе назваў жывёл, птушак, насякомых і іх дзеянняў на чалавека, эмацыянальна-экспрэсіўных слоў. Асаблівасці тэкстаў размоўнага стылю на марфалагічным узроўні. Выкарыстанне дзеяслоўных формаў з выражэннем імгненнасці дзеяння, формаў часу і ладу ў значэнні другіх формаў часу і ладу, скарочаных найменняў. Асаблівасці тэкстаў размоўнага стылю на сінтаксічным узроўні. Ужыванне простых, няпоўных (эліптычных) сказаў, складаных сказаў (часцей бяззлучнікавых) без адасобленых канструкцый і шматступеннай залежнасці, інверсаванага парадку слоў, паўтораў дзеясловаў-выказнікаў. Наяўнасць пытальных і клічных сказаў, далучальных, парцэляваных, плеанастычных канструкцый. Роля невербальных сродкаў (жэстаў, мімікі, інтанацыі). Стылістычныя памылкі ў тэкстах размоўнага стылю. Аналіз тэкстаў размоўнага стылю.

**8. Стылістычныя рэсурсы лексікі і фразеалогіі.** Лексічная стылістыка. Лексічнае значэнне слова ў стылістычным аспекце. Словы нейтральныя і стылістычна афарбаваныя. Стылістычныя паметы ў “Тлумачальным слоўніку беларускай мовы” і ў “Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы”. Стылістычная канатацыя лексічных адзінак і яе віды. Словы з эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай: ацэначныя словы, словы з пераносным значэннем, словы з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі. Словы з функцыянальна-стылістычнай афарбоўкай: лексіка кніжных стыляў, яе разнавіднасці (афіцыйна-справавая, навуковая, публіцыстычная, паэтычная), лексіка гутарковага стылю (словы размоўныя, прастамоўныя, дыялектныя). Патэнцыяльная вобразнасць слова. Выбар слова. Лексічная спалучальнасць. Стылістычнае выкарыстанне з’явы полісеміі (метафара, метанімія, сінекдаха). Стылістычная роля

агульнанародных і аўтарскіх параўнанняў. Стылістычнае выкарыстанне сістэмных адносін у лексіцы.
Стылістычная сінаніміка як сістэмна арганізаваная частка слоўніка сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Выяўленне стылістычных сінонімаў у тэкстах, аргументацыя іх ужывання. Структурныя асаблівасці радоў стылістычных сінонімаў. Сінонімы стылістычныя і семантыка-стылістычныя. Уплыў полісеміі на ўтварэнне радоў стылістычных сінонімаў. Ампліфікацыя як стылістычны прыём. Кантэкстуальныя сінонімы. Эўфемізмы. Стылістычная роля перыфразы як вобразнай адзінкі маўлення. Традыцыйныя і аўтарскія перыфразы. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў, амонімаў, паронімаў, іх вобразна-выяўленчыя якасці. Каламбур. Лексіка абмежаванага ўжытку (дыялектная, спецыяльная, жаргонная) і яе стылістычнае выкарыстанне. Стылістычная фукцыя устарэлай лексікі (гістарызмаў і архаізмаў). Неалагізмы агульнамоўныя і індывідуальна-аўтарскія наватворы, іх стылістычная характарыстыка. Стылістычныя рэсурсы фразеалогіі. Тыпы фразеалагічных адзінак паводле стылістычнай афарбоўкі: фразеалагізмы міжстылявыя і стылістычна афарбаваныя (размоўныя, кніжныя). Выкарыстанне стылістычна афарбаваных фразеалагічных адзінак у розных функцыянальных стылях. Змяненне і абнаўленне фразеалагізмаў у мастацкай літаратуры і публіцыстыцы. Памылкі ў выкарыстанні фразеалагічных адзінак.

**9. Стылістычныя рэсурсы марфалогіі.** Стылістычныя рэсурсы часцін мовы, марфалагічных катэгорый, формаў слоў. Стылістычныя рэсурсы назоўніка. Агульныя і ўласныя назоўнікі, іх характарыстычныя экспрэсіўныя якасці. З’ява антанамазіі. Стылістычныя асаблівасці родавых і лікавых формаў назоўніка. Стылістычнае адрозненне склонавых формаў назоўніка. Формы суб’ектыўнай ацэнкі назоўнікаў. Стылістычныя асаблівасці аддзеяслоўных назоўнікаў. Стылістычныя рэсурсы прыметніка. Намінатыўная, класіфікацыйная і вобразная, эстэтычная функцыі прыметнікаў. Стылістычнае адрозненне поўных і кароткіх формаў якасных прыметнікаў. Сінанімічныя формы ступеней параўнання прыметнікаў. Семантыка-стылістычныя адценні канструкцый са значэннем прыналежнасці. Стылістычныя рэсурсы займенніка. Стылістычнае выкарыстанне займеннікаў. Асаблівасці ўжывання асабовых займеннікаў: пропуск асабовага займенніка пры дзеяслове-выказніку; паўтарэнне асабовага займенніка ў ролі дзейніка; выкарыстанне асабовых займеннікаў з дадатковымі сэнсавымі і экспрэсіўнымі адценнямі. Асаблівасці стылістычнага выкарыстання займеннікаў іншых разрадаў. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні займеннікаў. Стылістычныя рэсурсы лічэбніка. Стылістычная дыферэнцыяцыя лічэбнікаў розных разрадаў. Стылістычныя рэсурсы дзеяслова і яго формаў. Вобразна-экспрэсіўныя якасці дзеяслова. Стылістычнае выкарыстанне формаў часу, трывання, ладу дзеяслова. Сінанімія асобных формаў дзеяслова. Стылявая функцыя формаў дзеепрыметніка. Стылістычныя рэсурсы службовых часцін мовы. Сінанімія прыназоўнікаў.

**10. Стылістычныя рэсурсы сінтаксісу.** Сінтаксічныя сінонімы, іх сутнасць. Стылістыка словазлучэнняў. Спалучальнасць моўных адзінак.

Сінанімія прыназоўнікавых і беспрыназоўнікавых канструкцый. Стылістыка простага сказа. Стылістычная роля прамога і адваротнага парадку слоў. Памылкі пры інверсійным ужыванні членаў сказа. Стылістыка аднасастаўных сказаў. Стылістыка складанага сказа. Сінанімія злучнікавых і бяззлучнікавых складаных сказаў. Стылістыка спалучальных і падпарадкавальных злучнікаў (і злучальных слоў) у складаных сказах. Паралельныя сінтаксічныя канструкцыі. Сінанімія дзеепрыметных і дзеепрыслоўных словазлучэнняў і даданых частак складанага сказа. Стылістычнае выкарыстанне аднародных членаў сказа, адасобленых слоў і выразаў, устаўных і пабочных канструкцый. Экспрэсіўнае вылучэнне членаў сказа (адчляненне, далучэнне, анакалуф). Стылістычныя прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення.

**11. Стылістыка тэксту. Структурныя адзінкі тэксту.** Стылістыка тэксту як адзін з напрамкаў функцыянальнай стылістыкі. Паняцце структуры тэксту ў лінгвістычных даследаваннях. Структурныя адзінкі тэксту. Празаічная страфа і фрагмент – асноўныя адзінкі тэксту. Звязнасць і цэласнасць тэксту, моўныя сродкі іх выражэння. План зместу і план выражэння. Паняцці ідэі і тэмы. Роля супастаўляльна-стылістычнага метаду аналізу пры характарыстыцы тэмы. Рэалізацыя зместу ў тыпах інфармацыі (фактычнай, канцэптуальнай, падтэкставай). Інтэртэкстуальнасць. Формы славеснага выражэння (вусная і пісьмовая, дыялагічная і маналагічная). Тыпы тэкстаў маналагічнай формы (апавяданне, апісанне, разважанне, азначэнне, тлумачэнне, інструктаванне). Разнавіднасці славеснасці (мастацкая і немастацкая, народная і кніжная). Паняцце моўнай кампазіцыі тэксту. Архітэктоніка. Сюжэт. Фабула. Роля славесных радоў у моўнай кампазіцыі тэксту. Вобраз аўтара і вобраз апавядальніка. Славесна-маўленчы аналіз тэксту. Тыпізацыя вобраза аўтара. Тыпы мастацкіх тэкстаў па суадносінах “вобраз аўтара – вобраз апавядальніка”. Моўныя і кампазіцыйныя прыёмы суб’ектывацыі аўтарскага аповеду.

## Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная праца | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | |
| | **СТЫЛІСТЫКА** | **24** | **24** | **48** | | |
| 1. | **Уводзіны** | **4** | **4** | **8** | | |
| 1.1 | ***Стылістыка як лінгвістычная дысцыпліна***<br>1. Стылістыка, яе змест і задачы. Месца курса “Стылістыка” ў сістэме лінгвістычных і нелінгвістычных дысцыплін (сувязь курса з лексікалогіяй, фразеалогіяй, арфаэпіяй, граматыкай, гісторыяй беларускай літаратурнай мовы, лінгвістычным аналізам тэксту; літаратурай, філасофіяй, гісторыяй і інш.). Стылістыка і культура маўлення, іх падабенства і адрозненне.<br>2. З гісторыі станаўлення стылістыкі як самастойнай лінгвістычнай дысцыпліны. Вывучэнне стылістыкі ў беларускай філалогіі.<br>3. Асноўныя напрамкі сучаснай стылістыкі. Стылістыка мовы, стылістыка маўлення, стылістыка мастацкай літаратуры. Стылістыка тэксту. Стылістыка дэкадавання. Прыёмы вылучэння сэнсавых момантаў твора ў стылістыцы дэкадавання (канвергенцыя, счапленне, эфект падманутага чакання).<br>4. Метады і прыёмы стылістычнага аналізу (семантыка-стылістычны, параўнальны, статыстычны; аналіз па слоўнікавых паметах, аналіз слова ў кантэксце, стылістычны эксперымент). | 2 | 2 | 4 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Ушчыльненае (камбінаванае) апытванне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.2 | ***Асноўныя паняцці стылістыкі***<br>1. Асноўныя паняцці стылістыкі (стыль, стылістычная сістэма, стылістычная норма, стылістычная афарбоўка і інш.).<br>2. Стылістычныя памылкі, іх адрозненне ад памылак сэнсавых, лексічных, граматычных. Сувязь стылістычных памылак з паняццямі матываванасці, нематываванасці. Разнавіднасці стылістычных памылак (выкарыстанне кніжнай і гутарковай лексікі ў вузкім кантэксце; тэрміналогіі, канцылярызмаў у неспецыяльных тэкстах; недарэчнай вобразнасці; моўных штампаў і плеаназмаў; немілагучных выразаў).<br>3. Паняцце функцыянальнага стылю. Прынцыпы вылучэння стыляў (сацыяльны, жанравы, функцыянальны і інш.). Тэорыя “трох стыляў”. Стылістычная сістэма мовы. Паняцці стылю, падстылю і жанру. Функцыянальны стыль як незамкнёная сістэма моўных сродкаў. | 2 | 2 | 4 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Франтальнае апытванне. Праверка падрыхтаваных тэкстаў |
| 2. | **Афіцыйна-справавы стыль** | **2** | **2** | **4** | | |
| | 1. З гісторыі развіцця афіцыйна-справавога стылю. Сфера выкарыстання афіцыйна-справавога стылю (афіцыйнае справаводства), форма зносін (пісьмовая і вусная маналагічная), мэта (выражэнне волі, загад, канстатацыя), характар узаемаадносін (афіцыйны). Функцыі афіцыйна-справавога стылю (паведамлення і ўздзеяння).Падстылі і жанры афіцыйна-справавога стылю (заканадаўчы: закон, канстытуцыя, указ і інш., дыпламатычны: камюніке, мемарандум, міжнародны дагавор і інш., адміністрацыйна-канцылярскі: заява, аб’ява, даверанасць, распіска, характарыстыка і інш.).<br>2. Асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю на лексічным узроўні. Адсутнасць эмацыянальных, суб’ектыўна ацэначных і гутарковых слоў. Ужыванне абстрактнай, тэрміналагічнай, спецыяльнай лексікі, абрэвіятур. Наяўнасць спецыфічных тэматычных груп (назваў асоб па іх функцыі ў афіцыйных зносінах, назваў дакументаў, іх частак, структуры, абазначэнняў службовых працэдур па ўзгадненні і зацвярджэнні, а таксама канцылярызмаў, устарэлай (архаічнай) лексікі).<br>3. Асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю на марфалагічным узроўні. Наяўнасць іменных часцін мовы. Ужыванне аддзеяслоўных назоўнікаў з адмоўем і без яго, імператыўных дзеясловаў (форма загаднага ладу, форма інфінітыва са значэннем загаду). Пашыранасць адыменных прыназоўнікаў і састаўных злучнікаў.<br>4. Асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю на сінтаксічным узроўні. Структура кампазіцыйных канструкцый (раздзелы, параграфы, пункты, падпункты). | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Пісьмовы аналіз тэкстаў афіцыйнага стылю |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Сродкі вылучэння тэкставых сегментаў афіцыйных тэкстаў (арабскія лічбы, абзац, працяжнік). Ужыванне спецыфічных устойлівых словазлучэнняў, стандартных канструкцый, дзеяслоўных словазлучэнняў (дзеяслоў+назоўнік) замест дзеясловаў, безасабовых, інфінітыўных канструкцый са значэннем імператыўнасці, сказаў ускладненай будовы, складаных сказаў. | | | | | |
| | 5. Стылістычныя памылкі пры афармленні афіцыйных папер.<br>6. Стылістычная праўка тэкстаў афіцыйна-справавога стылю.<br>7. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў афіцыйна-справавога стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў.<br>8. Аналіз тэкстаў афіцыйна-справавога стылю. | | | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Індывідуальнае апытванне |
| 3. | **Навуковы стыль** | **2** | **2** | **4** | | |
| | 1. З гісторыі развіцця навуковага стылю. Сфера выкарыстання (навука, вытворчасць, адукацыя), форма зносін (пісьмовая і вусная маналагічная), мэта (паведамленне інфармацыі), характар узаемаадносін (афіцыйны). Спецыфіка інфармацыйнай функцыі навуковага стылю. Падстылі і жанры навуковага стылю (уласна навуковы: манаграфія, дысертацыя, аўтарэферат і інш., навукова-вучэбны: падручнік, лекцыя, семінарскі даклад і інш., навукова-папулярны: выступленне, дапаможнік, артыкул і інш.).<br>2. Асаблівасці тэкстаў навуковага стылю на лексічным узроўні. Асноўныя групы лексікі навуковага стылю (нейтральныя словы і выразы, словы агульнанавуковага ўжывання, вузкаспецыяльная і агульнанавуковая тэрміналогія). Адметнасці лексічных сродкаў тэкстаў навукова-папулярнага падстылю (тропы, гутарковыя словы). 3. Асаблівасці тэкстаў навуковага стылю на марфалагічным узроўні. Ужыванне абстрактных назоўнікаў, формаў роднага склону, адзіночнага і множнага ліку назоўнікаў. Выкарыстанне прыметнікаў у састаўных тэрмінах. Наяўнасць формаў цяперашняга часу дзеясловаў (цяперашні пазачасавы), 1-й асобы множнага ліку. Пашыранасць вытворных прыназоўнікаў.<br>4. Асаблівасці тэкстаў навуковага стылю на сінтаксічным узроўні. Выкарыстанне ўскладненых і складаных сінтаксічных канструкцый, пасіўных адзінак. “Расшчапленне” выказніка. Перавага злучнікавых сказаў над бяззлучнікавымі. Рэалізацыя сэнсавай сувязі паміж сказамі навуковых тэкстаў (лексічны і сінанімічны паўторы). | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Пісьмовы аналіз тэкстаў навуковага стылю |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Стылістычныя памылкі ў тэкстах навуковага стылю.<br>6. Стылістычная праўка тэкстаў навуковага стылю.<br>7. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў навуковага стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў.<br>8. Аналіз тэкстаў навуковага стылю. | | | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Пісьмовыя работы па стылістычным аналізе тэкстаў навуковага стылю |
| 4. | **Публіцыстычны стыль** | **2** | **2** | **4** | | |
| | 1. З гісторыі развіцця публіцыстычнага стылю. Сфера выкарыстання (грамадска-палітычная, культурная, спартыўная), форма зносін (пісьмовая ці вусная маналагічная, пісьмовая ці вусная дыялагічная), мэта, характар узаемаадносін (афіцыйны), функцыі публіцыстычнага стылю. Падстылі публіцыстычнага стылю (газетна-публіцыстычны, радыё- і тэлежурналісцкі, аратарскі). Жанры публіцыстычнага стылю (інфармацыйныя: справаздача, рэпартаж, інтэрв'ю і інш., аналітычныя: карэспандэнцыя, рэцэнзія, агляд і інш., мастацка-публіцыстычныя: нарыс, эсэ, фельетон і інш.). Жанравая мадыфікацыя тэкстаў публіцыстычнага стылю. Адрозненне тэкстаў публіцыстычнага і мастацкага стыляў.<br>2. Асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю на лексічным узроўні. Стандарт і экспрэсія ў публіцыстычных тэкстах. Роля функцыі паведамлення ў фармаванні нейтральнай лексікі і моўных штампаў. Роля функцыі ўздзеяння ў фармаванні ацэначнай лексікі. Наяўнасць грамадска-палітычнай лексікі.<br>3. Асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю на марфалагічным узроўні. Выкарыстанне абстрактных аддзеяслоўных назоўнікаў, адцягненых назоўнікаў у форме множнага ліку без абазначэння колькасці, дзеясловаў загаднага ладу.<br>4. Асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю на сінтаксічным узроўні. Ужыванне сегментаваных і ўводных канструкцый, парцэляцыі, намінатыўных і эліптычных сказаў, інверсаванага парадку слоў. | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д, 4д | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні |
| | 5. Стылістычныя памылкі ў тэкстах публіцыстычнага стылю.<br>6. Стылістычная праўка тэкстаў публіцыстычнага стылю.<br>7. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў публіцыстычнага стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў.<br>8. Супастаўляльна-стылістычны аналіз нарыса і мастацкага тэксту.<br>9. Напісанне эсэ, нататкі, карэспандэнцыі.<br>10. Аналіз тэкстаў публіцыстычнага стылю. | | | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д, 4д | Пісьмовыя практыкаванні |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 5. | **Мастацкі стыль** | **2** | **2** | **6** | | |
| | 1. З гісторыі развіцця мастацкага стылю. Пытанне пра стылявы статус мастацкага стылю ў лінгвістыцы. Уплыў мастацкага стылю на іншыя функцыянальныя стылі. Уплыў усіх функцыянальных стыляў на мову мастацкага твора. Сфера выкарыстання мастацкага стылю (эстэтычная), форма зносін (дыялагічная і маналагічная пісьмовая), мэта (сацыяльна-эстэтычнае ўздзеянне), характар узаемаадносін (неафіцыйны). Спецыфіка эстэтычнай функцыі мастацкага стылю.<br>2. Падстылі і жанры мастацкага стылю (паэтычны: верш, паэма і інш., празаічны: апавяданне, аповесць і інш., драматургічны: камедыя, трагедыя і інш.).<br>3. Асаблівасці мастацкага стылю (экспрэсіўнасць, эмацыянальнасць, вобразнасць). Роля гукавой арганізацыі твора ў стварэнні вобраза. Класіфікацыя гукапісных элементаў (простыя гукавыя паўторы, ускладненыя гукавыя паўторы, складаныя гукавыя паўторы). Роля тропаў (метафар, метанімій, сінекдах, эпітэтаў, параўнанняў, гіпербал, літот і інш.) у фармаванні мастацкага вобраза. Трыяда мастацкага вобраза (вобраз-індыкатар, вобраз-троп, вобраз-сімвал). Сродкі стварэння вобразнасці (сінонімы, антонімы, адметнае спалучэнне моўных адзінак і інш.). | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Рэфераты |
| | 4. Трансфармацыя моўных адзінак у кантэксце мастацкага твора. Камбінаторнае прырашчэнне сэнсу. Празаічная і паэтычная арганізацыя мастацкага тэксту. Класічная і арнаментальная проза. Празаізацыя вершаванага тэксту і сродкі яе выражэння (дыялагізацыя, словы бытавога зместу і інш.). Паэтызацыя празаічнага тэксту і сродкі яе выражэння (індывідуальна-аўтарскія вобразы, стылістычна афарбаваныя словы і інш.). | | | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Ушчыльненае (камбінаванае) апытванне |
| | 5. Асаблівасці сінтаксічнай арганізацыі аўтарскага маўлення і маўлення персанажаў.<br>6. Сродкі паэтычнага сінтаксісу (анафара, эпіфара, кальцо, паралелізм, градацыя і інш<br>7. Праблема індывідуальнага стылю пісьменніка.<br>8. Аналіз тэкстаў мастацкага стылю. | | | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Пісьмовыя і вусныя практыкаванні |
| 6. | **Канфесійны стыль** | **2** | **2** | **2** | | |
| | 1. З гісторыі развіцця канфесійнага стылю. Сфера выкарыстання канфесійнага стылю (рэлігійная літаратура), форма зносін (маналагічная пісьмовая), мэта (эмацыянальнае ўздзеянне), характар узаемаадносін (афіцыйны). Спецыфічныя асаблівасці канфесійнага стылю (абагульненасць, дакладанасць, лагічнасць выкладу).<br>2. Жанры кананічнай, царкоўна-рэлігійнай, рэлігійна-бытавой літаратуры (псалмы, прадмовы, пасляслоўі, акафісты і інш.).<br>3. Моўныя асаблівасці тэкстаў канфесійнага стылю. Наяўнасць адметных | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 2д | Канспекты |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | метафарычных зачынаў, вобразных сродкаў мовы, спецыфічнай лексікі. Шырокае выкарыстанне прытчаў. Ужыванне дзеепрыслоўных зваротаў, прыёмаў нанізвання простых сказаў і адмаўлення праз адмаўленне. | | | | | |
| 7. | **Размоўны (гутарковы) стыль** | **2** | **2** | **4** | | |
| | 1. Месца размоўнага стылю ў сістэме функцыяльных стыляў. Сфера выкарыстання размоўнага стылю (бытавая), форма зносін (дыялагічная і маналагічная), мэта (камунікацыя), характар узаемаадносін (неафіцыйны). Жанры размоўнага стылю (асабістае пісьмо, гутарка, тэлефонная размова, дзённік і інш.).<br>2. Асаблівасці тэкстаў размоўнага стылю на лексічным узроўні. Ужыванне нелітаратурных моўных адзінак (прастамоўнай лексікі, дыялектызмаў, прафесіяналізмаў, жарганізмаў), метафар, заснаваных на пераносе назваў жывёл, птушак, насякомых і іх дзеянняў на чалавека, эмацыянальна-экспрэсіўных слоў.<br>3. Асаблівасці тэкстаў размоўнага стылю на марфалагічным узроўні. Выкарыстанне дзеяслоўных формаў з выражэннем імгненнасці дзеяння, формаў часу і ладу ў значэнні другіх формаў часу і ладу, скарочаных найменняў.<br>4. Асаблівасці тэкстаў размоўнага стылю на сінтаксічным узроўні. Ужыванне простых, няпоўных (эліптычных) сказаў, складаных сказаў (часцей бяззлучнікавых) без адасобленых канструкцый і шматступеннай залежнасці, інверсаванага парадку слоў, паўтораў дзеясловаў-выказнікаў. Наяўнасць пытальных і клічных сказаў, далучальных, парцэляваных, плеанастычных канструкцый. | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Пісьмовыя практыкаванні |
| | 5. Роля невербальных сродкаў (жэстаў, мімікі, інтанацыі).<br>6. Стылістычныя памылкі ў тэкстах размоўнага стылю.<br>7. Аналіз тэкстаў размоўнага стылю. | | | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Франтальнае апытванне |
| 8. | **Стылістычныя рэсурсы лексікі і фразеалогіі** | **2** | **2** | **4** | | |
| | 1. Лексічная стылістыка. Лексічнае значэнне слова ў стылістычным аспекце. Словы нейтральныя і стылістычна афарбаваныя. Стылістычныя паметы ў “Тлумачальным слоўніку беларускай мовы” і ў “Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы”. Стылістычная канатацыя лексічных адзінак і яе віды. Словы з эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай: ацэначныя словы, словы з пераносным значэннем, словы з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі. Словы з функцыянальна-стылістычнай афарбоўкай: лексіка кніжных стыляў, яе разнавіднасці (афіцыйна-справавая, навуковая, публіцыстычная, паэтычная), лексіка гутарковага стылю (словы размоўныя, прастамоўныя, дыялектныя).<br>2. Патэнцыяльная вобразнасць слова. Выбар слова. Лексічная спалучальнасць. | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Стылістычнае выкарыстанне з’явы полісеміі (метафара, метанімія, сінекдаха). Стылістычная роля агульнанародных і аўтарскіх параўнанняў. Стылістычнае выкарыстанне сістэмных адносін у лексіцы.<br>3. Стылістычная сінаніміка як сістэмна арганізаваная частка слоўніка сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Выяўленне стылістычных сінонімаў у тэкстах, аргументацыя іх ужывання. Структурныя асаблівасці радоў стылістычных сінонімаў. Сінонімы стылістычныя і семантыка-стылістычныя. Уплыў полісеміі на ўтварэнне радоў стылістычных сінонімаў. Ампліфікацыя як стылістычны прыём. Кантэкстуальныя сінонімы. Эўфемізмы.<br>4. Стылістычная роля перыфразы як вобразнай адзінкі маўлення. Традыцыйныя і аўтарскія перыфразы. | | | | | |
| | 5. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў, амонімаў, паронімаў, іх вобразна-выяўленчыя якасці. Каламбур.<br>6. Лексіка абмежаванага ўжытку (дыялектная, спецыяльная, жаргонная) і яе стылістычнае выкарыстанне.<br>7. Стылістычная фукцыя устарэлай лексікі (гістарызмаў і архаізмаў). 8. Неалагізмы агульнамоўныя і індывідуальна-аўтарскія наватворы, іх стылістычная характарыстыка.<br>9. Стылістычныя рэсурсы фразеалогіі. Тыпы фразеалагічных адзінак паводле стылістычнай афарбоўкі: фразеалагізмы міжстылявыя і стылістычна афарбаваныя (размоўныя, кніжныя). Выкарыстанне стылістычна афарбаваных фразеалагічных адзінак у розных функцыянальных стылях. Змяненне і абнаўленне фразеалагізмаў у мастацкай літаратуры і публіцыстыцы. Памылкі ў выкарыстанні фразеалагічных адзінак. | | | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Франтальнае апытванне |
| 9. | **Стылістычныя рэсурсы марфалогіі** | **2** | **2** | **4** | | |
| | 1. Стылістычныя рэсурсы часцін мовы, марфалагічных катэгорый, формаў слоў.<br>2. Стылістычныя рэсурсы назоўніка. Агульныя і ўласныя назоўнікі, іх характарыстычныя экспрэсіўныя якасці. З’ява антанамазіі. Стылістычныя асаблівасці родавых і лікавых формаў назоўніка. Стылістычнае адрозненне склонавых формаў назоўніка. Формы суб’ектыўнай ацэнкі назоўнікаў. Стылістычныя асаблівасці аддзеяслоўных назоўнікаў.<br>3. Стылістычныя рэсурсы прыметніка. Намінатыўная, класіфікацыйная і вобразная, эстэтычная функцыі прыметнікаў. Стылістычнае адрозненне поўных і кароткіх формаў якасных прыметнікаў. Сінанімічныя формы ступеней параўнання | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Пісьмовыя і вусныя практыкаванні |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | прыметнікаў. Семантыка-стылістычныя адценні канструкцый са значэннем прыналежнасці.<br>4. Стылістычныя рэсурсы займенніка. Стылістычнае выкарыстанне займеннікаў. Асаблівасці ўжывання асабовых займеннікаў: пропуск асабовага займенніка пры дзеяслове-выказніку; паўтарэнне асабовага займенніка ў ролі дзейніка; выкарыстанне асабовых займеннікаў з дадатковымі сэнсавымі і экспрэсіўнымі адценнямі. Асаблівасці стылістычнага выкарыстання займеннікаў іншых разрадаў. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні займеннікаў.<br>5. Стылістычныя рэсурсы лічэбніка. Стылістычная дыферэнцыяцыя лічэбнікаў розных разрадаў.<br>6. Стылістычныя рэсурсы дзеяслова і яго формаў. Вобразна-экспрэсіўныя якасці дзеяслова. Стылістычнае выкарыстанне формаў часу, трывання, ладу дзеяслова. Сінанімія асобных формаў дзеяслова. Стылявая функцыя формаў дзеепрыметніка. | | | | | |
| | 7. Стылістычныя рэсурсы службовых часцін мовы. Сінанімія прыназоўнікаў. | | | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Рэфераты |
| 10. | **Стылістычныя рэсурсы сінтаксісу** | **2** | **2** | **4** | | |
| | 1. Сінтаксічныя сінонімы, іх сутнасць.<br>2. Стылістыка словазлучэнняў. Спалучальнасць моўных адзінак. Сінанімія прыназоўнікавых і беспрыназоўнікавых канструкцый.<br>3. Стылістыка простага сказа. Стылістычная роля прамога і адваротнага парадку слоў. Памылкі пры інверсійным ужыванні членаў сказа. Стылістыка аднасастаўных сказаў.<br>4. Стылістыка складанага сказа. Сінанімія злучнікавых і бяззлучнікавых складаных сказаў. Стылістыка спалучальных і падпарадкавальных злучнікаў (і злучальных слоў) у складаных сказах.<br>5. Паралельныя сінтаксічныя канструкцыі. Сінанімія дзеепрыметных і дзеепрыслоўных словазлучэнняў і даданых частак складанага сказа.<br>6. Стылістычнае выкарыстанне аднародных членаў сказа, адасобленых слоў і выразаў, устаўных і пабочных канструкцый.<br>7. Экспрэсіўнае вылучэнне членаў сказа (адчляненне, далучэнне, анакалуф). | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Пісьмовыя і вусныя практыкаванні |
| | 8. Стылістычныя прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення. | | | 2 | 1, 2, 2д, 3д, 4д | Індывідуальнае апытванне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 11. | **Стылістыка тэксту. Структурныя адзінкі тэксту** | **2** | **2** | **4** | | |
| | 1. Стылістыка тэксту як адзін з напрамкаў функцыянальнай стылістыкі. Паняцце структуры тэксту ў лінгвістычных даследаваннях. Структурныя адзінкі тэксту. Празаічная страфа і фрагмент – асноўныя адзінкі тэксту.<br>2. Звязнасць і цэласнасць тэксту, моўныя сродкі іх выражэння. План зместу і план выражэння. Паняцці ідэі і тэмы. Роля супастаўляльна-стылістычнага метаду аналізу пры характарыстыцы тэмы.<br>3. Рэалізацыя зместу ў тыпах інфармацыі (фактычнай, канцэптуальнай, падтэкставай). Інтэртэкстуальнасць.<br>Формы славеснага выражэння (вусная і пісьмовая, дыялагічная і маналагічная).<br>4. Тыпы тэкстаў маналагічнай формы (апавяданне, апісанне, разважанне, азначэнне, тлумачэнне, інструктаванне). Разнавіднасці славеснасці (мастацкая і немастацкая, народная і кніжная).<br>5. Паняцце моўнай кампазіцыі тэксту. Архітэктоніка. Сюжэт. Фабула. Роля славесных радоў у моўнай кампазіцыі тэксту. | 2 | 2 | 2 | 1, 3д, 4д | Рэфераты |
| | 6. Вобраз аўтара і вобраз апавядальніка. Славесна-маўленчы аналіз тэксту. Тыпізацыя вобраза аўтара.<br>7. Тыпы мастацкіх тэкстаў па суадносінах “вобраз аўтара – вобраз апавядальніка”.<br>8. Моўныя і кампазіцыйныя прыёмы суб’ектывацыі аўтарскага аповеду. | | | 2 | 1, 3д, 4д | Франтальнае апытванне |
| | ***Усяго гадзін*** | **24** | **24** | **48** | | **залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Старасценка, Т. Я. Стылістыка беларускай мовы [Электронны рэсурс] : інтэрактыўны электрон. вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1–02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)» / Т. Я. Старасценка // СДО Moodle / Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Рэжым доступу: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2349. – Дата доступу: 04.03.2024.
2. Багамолава, А. М. Стылістыка і культура беларускага маўлення / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2017. – 344 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Жаўняровіч, П. П. Публіцыстычны дыскурс Уладзіміра Караткевіча / П. П. Жаўняровіч ; навук. рэд. В. І. Іўчанкаў. – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2011. – 244 с.
2. Каўрус, А. А. Стылістыка беларускай мовы / А. А. Каўрус. – 3-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нар. асвета, 1992. – 206 с.
3. Старасценка, Т. Я. Стылістыка беларускай мовы : вучэб.-метад. дапам. / Т. Я. Старасценка, В. В. Урбан, Ф. С. Шумчык. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2009. – 219 с.
4. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы : вучэб. дапам. / М. Я. Цікоцкі. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 294 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з’яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодваць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з’яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады і формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на даную падрыхтоўку.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённага аддзялення накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб’ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад месца і часу правядзення самастойнай працы, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтамі дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна можа прадугледжваць:

– выкананне самастойных прац;

– выкананне кантрольных прац;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па стылістыцы;

– абарону выкананых прац;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя віды заданняў для самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);
– складанне плана тэксту;
– стылістычны аналіз тэксту;
– канспектаванне тэксту;
– праца са слоўнікамі, даведнікамі; азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;
– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;
– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для замацавання і сістэматызацыі ведаў, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:
– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);
– складанне планаў і тэзісаў адказаў;
– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;
– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;
– адказы на кантрольныя пытанні;
– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;
– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;
– складанне бібліяграфіі і інш.;

Для фарміравання ўменняў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:
– выкананне практыкаванняў па ўзоры;
– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;
– выкананне стылістычнага аналізу і пад.;
– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыя- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод канкрэтных відаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры;

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосабу з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю);

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю, дзякуючы чаму, самастойная работа набывае даследчы характар).

Для правядзення кантролю самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:
– праверка індывідуальных заданняў;
– семінарскія заняткі;
– калёквіумы;
– канферэнцыі;

– залікі па тэмах / раздзелах;

– тэсціраванне;

– кантрольныя работы.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляецца карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойных прац, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г. д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з'яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкцыі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай работы з'яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні запланаванай работы. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковы аналіз, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г. з. зрабіць гэтыя недахопы аб'ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

| № н/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СПС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Стылістыка як лінгвістычная дысцыпліна** (Метады і прыёмы стылістычнага аналізу (семантыка-стылістычны, параўнальны, статыстычны; аналіз па слоўнікавых паметах, аналіз слова ў кантэксце, стылістычны эксперымент). | 4 | Прааналізаваць тэксты з улікам розных метадаў і прыёмаў стылістычнага аналізу. | Пісьмовае заданне |
| 2. | **Асноўныя паняцці стылістыкі** (Паняцце функцыянальнага стылю. Прынцыпы вылучэння стыляў (сацыяльны, жанравы, функцыянальны і інш.). Тэорыя “трох стыляў”. Стылістычная сістэма мовы. Паняцці стылю, падстылю і жанру. Функцыянальны стыль як незамкнёная сістэма моўных сродкаў). | 4 | Падрыхтаваць рэфераты пра прынцыпы вылучэння стыляў. | Прэзентацыя |
| 3. | **Афіцыйна-справавы стыль** (Асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю на сінтаксічным узроўні. Структура кампазіцыйных канструкцый (раздзелы, параграфы, пункты, падпункты). Сродкі вылучэння тэкставых сегментаў афіцыйных тэкстаў (арабскія лічбы, абзац, працяжнік). Ужыванне спецыфічных устойлівых словазлучэнняў, стандартных канструкцый, дзеяслоўных словазлучэнняў (дзеяслоў+назоўнік) замест дзеясловаў, безасабовых, інфінітыўных канструкцый са значэннем імператыўнасці, сказаў ускладненай будовы, складаных сказаў). | 2 | Прааналізаваць тэксты афіцыйна-справавога стылю на сінтаксічным узроўні. | Вуснае заданне |
| 4. | **Афіцыйна-справавы стыль** (Стылістычныя памылкі пры афармленні афіцыйных папер. Стылістычная праўка тэкстаў афіцыйна-справавога стылю. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў афіцыйна-справавога стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў. Аналіз тэкстаў афіцыйна-справавога стылю). | 2 | Выканаць стылістычную праўку тэкстаў афіцыйна-справавога стылю. | Пісьмовае заданне |
| 5. | **Навуковы стыль** (Асаблівасці тэкстаў навуковага стылю на сінтаксічным узроўні. Выкарыстанне ўскладненых і складаных сінтаксічных канструкцый, пасіўных адзінак. “Расшчапленне” выказніка. Перавага злучнікавых сказаў над бяззлучнікавымі. Рэалізацыя сэнсавай сувязі паміж сказамі навуковых тэкстаў (лексічны і сінанімічны паўторы). | 2 | Прааналізаваць тэксты навуковага стылю на сінтаксічным узроўні. | Вуснае заданне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6. | **Навуковы стыль** (Стылістычныя памылкі ў тэкстах навуковага стылю. Стылістычная праўка тэкстаў навуковага стылю. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў навуковага стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў. Аналіз тэкстаў навуковага стылю). | 2 | Выканаць стылістычную праўку тэкстаў навуковага стылю. | Пісьмовае заданне |
| 7. | **Публіцыстычны стыль** (Асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю на сінтаксічным узроўні. Ужыванне сегментаваных і ўводных канструкцый, парцэляцыі, намінатыўных і эліптычных сказаў, інверсаванага парадку слоў). | 2 | Прааналізаваць тэксты публіцыстычнага стылю на сінтаксічным узроўні. | Вуснае заданне |
| 8. | **Публіцыстычны стыль** (Стылістычныя памылкі ў тэкстах публіцыстычнага стылю. Стылістычная праўка тэкстаў публіцыстычнага стылю. Стылістычнае выкарыстанне сродкаў публіцыстычнага стылю ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў. Супастаўляльна-стылістычны аналіз нарыса і мастацкага тэксту. Напісанне эсэ, нататкі, карэспандэнцыі. Аналіз тэкстаў публіцыстычнага стылю). | 2 | Выканаць стылістычную праўку тэкстаў публіцыстычнага стылю. | Пісьмовае заданне |
| 9. | **Мастацкі стыль** (Асаблівасці мастацкага стылю (экспрэсіўнасць, эмацыянальнасць, вобразнасць). Роля гукавой арганізацыі твора ў стварэнні вобраза. Класіфікацыя гукапісных элементаў (простыя гукавыя паўторы, ускладненыя гукавыя паўторы, складаныя гукавыя паўторы). Роля тропаў (метафар, метанімій, сінекдах, эпітэтаў, параўнанняў, гіпербал, літот і інш.) у фармаванні мастацкага вобраза. Трыяда мастацкага вобраза (вобраз-індыкатар, вобраз-троп, вобраз-сімвал). Сродкі стварэння вобразнасці (сінонімы, антонімы, адметнае спалучэнне моўных адзінак і інш.). | 2 | Скласці слоўнік па тэме з дапамогай рэкамен-даваных тэарэтычных крыніц | Канспект |
| 10. | **Мастацкі стыль** (Трансфармацыя моўных адзінак у кантэксце мастацкага твора. Камбінаторнае прырашчэнне сэнсу. Празаічная і паэтычная арганізацыя мастацкага тэксту. Класічная і арнаментальная проза. Празаізацыя вершаванага тэксту і сродкі яе выражэння (дыялагізацыя, словы бытавога зместу і інш.). Паэтызацыя празаічнага тэксту і сродкі яе выражэння (індывідуальна-аўтарскія вобразы, стылістычна афарбаваныя словы і інш.). | 2 | Падабраць прыклады сэнсавай і эмацыянальна-экспрэсіўнай трансфармацыі моўных адзінак у мастацкім тэксце. | Вуснае заданне |
| 11. | **Мастацкі стыль** (Асаблівасці сінтаксічнай арганізацыі аўтарскага маўлення і маўлення персанажаў. Сродкі | 2 | Вызначыць моўныя асаблівасці | Прэзентацыя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | паэтычнага сінтаксісу (анафара, эпіфара, кальцо, паралелізм, градацыя і інш.). Праблема індывідуальнага стылю пісьменніка. Аналіз тэкстаў мастацкага стылю). | | ідыястылю пісьменніка (на выбар). | |
| 12. | **Канфесійны стыль**<br>(Жанры кананічнай, царкоўна-рэлігійнай, рэлігійна-бытавой літаратуры (псалмы, прадмовы, пасляслоўі, акафісты і інш.). | 2 | Заканспектаваць матэрыял па рэкамендаваных тэарэтычных крыніцах. | Канспект |
| 13. | **Размоўны (гутарковы) стыль**<br>(Месца размоўнага стылю ў сістэме функцыяльных стыляў. Сфера выкарыстання размоўнага стылю (бытавая), форма зносін (дыялагічная і маналагічная), мэта (камунікацыя), характар узаемаадносін (неафіцыйны). Жанры размоўнага стылю (асабістае пісьмо, гутарка, тэлефонная размова, дзённік і інш.). | 2 | Падрыхтаваць рэфераты па гісторыі станаўлення размоўнага стылю. | Прэзентацыя |
| 14. | **Размоўны (гутарковы) стыль**<br>(Роля невербальных сродкаў (жэстаў, мімікі, інтанацыі. Стылістычныя памылкі ў тэкстах размоўнага стылю. Аналіз тэкстаў размоўнага стылю). | 2 | Зрабіць стылістычны аналіз тэкстаў размоўнага стылю. | Вуснае заданне |
| 15. | **Стылістычныя рэсурсы лексікі і фразеалогіі**<br>(Стылістычная сінаніміка як сістэмна арганізаваная частка слоўніка сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Выяўленне стылістычных сінонімаў у тэкстах, аргументацыя іх ужывання. Структурныя асаблівасці радоў стылістычных сінонімаў. Сінонімы стылістычныя і семантыка-стылістычныя. Уплыў полісеміі на ўтварэнне радоў стылістычных сінонімаў. Ампліфікацыя як стылістычны прыём. Кантэкстуальныя сінонімы. Эўфемізмы). | 2 | Падрыхтаваць даклады па стылістычнай сінаніміцы. | Прэзентацыя |
| 16. | **Стылістычныя рэсурсы лексікі і фразеалогіі**<br>(Стылістычнае выкарыстанне антонімаў, амонімаў, паронімаў, іх вобразна-выяўленчыя якасці. Каламбур. Лексіка абмежаванага ўжытку (дыялектная, спецыяльная, жаргонная) і яе стылістычнае выкарыстанне. Стылістычная фукцыя устарэлай лексікі (гістарызмаў і архаізмаў). Неалагізмы агульнамоўныя і індывідуальна-аўтарскія наватворы, іх стылістычная характарыстыка. Стылістычныя рэсурсы фразеалогіі. Тыпы фразеалагічных адзінак паводле стылістычнай афарбоўкі: фразеалагізмы міжстылявыя і стылістычна афарбаваныя (размоўныя, кніжныя). Выкарыстанне стылістычна афарбаваных фразеалагічных адзінак у розных функцыянальных стылях. Змяненне і абнаўленне фразеалагізмаў у мастацкай літаратуры і | 2 | Заканспектаваць матэрыял па рэкамендаваных тэарэтычных крыніцах. | Канспект |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | публіцыстыцы. Памылкі ў выкарыстанні фразеалагічных адзінак). | | | |
| 17. | **Стылістычныя рэсурсы марфалогіі** (Стылістычныя рэсурсы дзеяслова і яго формаў. Вобразна-экспрэсіўныя якасці дзеяслова. Стылістычнае выкарыстанне формаў часу, трывання, ладу дзеяслова. Сінанімія асобных формаў дзеяслова. Стылявая функцыя формаў дзеепрыметніка). | 2 | Выканаць стылістычны аналіз пераноснага ўжывання дзеясловаў у тэкстах мастацкага стылю. | Пісьмовае заданне |
| 18. | **Стылістычныя рэсурсы марфалогіі** (Стылістычныя рэсурсы службовых часцін мовы. Сінанімія прыназоўнікаў). | 2 | Падрыхтаваць рэфераты па стылістычных рэсурсах службовых часцін мовы. | Прэзентацыя |
| 19. | **Стылістычныя рэсурсы сінтаксісу** (Экспрэсіўнае вылучэнне членаў сказа (адчляненне, далучэнне, анакалуф). | 2 | Законспектаваць матэрыял па рэкамендаваных тэарэтычных крыніцах. | Канспект |
| 20. | **Стылістычныя рэсурсы сінтаксісу** (Стылістычныя прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення). | 2 | Выканаць стылістычны аналіз прыёмаў сінтаксічнай арганізацыі маўлення | Пісьмовае заданне |
| 21. | **Стылістыка тэксту. Структурныя адзінкі тэксту** (Паняцце моўнай кампазіцыі тэксту. Архітэктоніка. Сюжэт. Фабула. Роля славесных радоў у моўнай кампазіцыі тэксту). | 2 | Знайсці прыклады славесных радоў і прааналізаваць іх ролю ў моўнай кампазіцыі. | Вуснае заданне |
| 22. | **Стылістыка тэксту. Структурныя адзінкі тэксту** (Вобраз аўтара і вобраз апавядальніка. Славесна-маўленчы аналіз тэксту. Тыпізацыя вобраза аўтара. Тыпы мастацкіх тэкстаў па суадносінах “вобраз аўтара – вобраз апавядальніка”. Моўныя і кампазіцыйныя прыёмы суб’ектывацыі аўтарскага аповеду). | 2 | Законспектаваць матэрыял па рэкамендаваных тэарэтычных крыніцах. | Канспект |
| | **Усяго** | **48** | | |

## ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ,

## ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “СТЫЛІСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

1. Вусны кантроль:

– франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках,

– калёквіумы,

– даклады на канферэнцыях,

– вусны аналіз тэкстаў розных стыляў,

– вусны залік.

2. Пісьмовы кантроль:

– тэрміналагічныя дыктанты,

– кантрольныя работы,

– пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях,

– рэфераты,

– пісьмовы аналіз тэкстаў розных стыляў,

– пісьмовы залік.

3. Тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

## ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

## ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “СТЫЛІСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

1. Стылістыка як лінгвістычная дысцыпліна, яе змест і задачы. Месца курса “Стылістыка беларускай мовы” ў сістэме лінгвістычных і нелінгвістычных дысцыплін. Стылістыка і культура маўлення, іх падабенства і адрозненне.

2. З гісторыі станаўлення стылістыкі як самастойнай лінгвістычнай дысцыпліны. Вывучэнне стылістыкі ў беларускай філалогіі.

3. Асноўныя напрамкі сучаснай стылістыкі. Стылістыка мовы, стылістыка маўлення, стылістыка мастацкай літаратуры. Стылістыка тэксту.

4. Стылістыка дэкадавання. Прыёмы вылучэння сэнсавых момантаў твора ў стылістыцы дэкадавання (канвергенцыя, счапленне, эфект падманутага чакання).

5. Метады і прыёмы стылістычнага аналізу (семантыка-стылістычны, параўнальны, статыстычны; аналіз па слоўнікавых паметах, аналіз слова ў кантэксце, стылістычны эксперымент).

6. Асноўныя паняцці стылістыкі (стыль, стылістычная сістэма, стылістычная норма, стылістычная афарбоўка і інш.).

7. Стылістычныя памылкі, іх адрозненне ад памылак сэнсавых, лексічных, граматычных. Разнавіднасці стылістычных памылак.

8. Паняцце функцыянальнага стылю. Прынцыпы вылучэння стыляў (сацыяльны, жанравы, функцыянальны і інш.). Тэорыя “трох стыляў”. Стылістычная сістэма мовы.

9. Паняцці стылю, падстылю і жанру. Функцыянальны стыль як незамкнёная сістэма моўных сродкаў.

10. Афіцыйна-справавы стыль. З гісторыі развіцця афіцыйна-справавога стылю. Падстылі і жанры афіцыйна-справавога стылю. Асаблівасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю на лексічным, марфалагічным, сінтаксічным узроўнях.

11. Навуковы стыль. З гісторыі развіцця навуковага стылю. Падстылі і жанры навуковага стылю. Асаблівасці тэкстаў навуковага стылю на лексічным, марфалагічным, сінтаксічным узроўнях.

12. Публіцыстычны стыль. З гісторыі развіцця публіцыстычнага стылю. Падстылі і жанры публіцыстычнага стылю. Асаблівасці тэкстаў публіцыстычнага стылю на лексічным, марфалагічным, сінтаксічным узроўнях.

13. Мастацкі стыль. З гісторыі развіцця мастацкага стылю. Пытанне пра стылявы статус мастацкага стылю ў лінгвістыцы. Падстылі і жанры мастацкага стылю. Уплыў мастацкага стылю на іншыя функцыянальныя стылі.

14. Роля тропаў (метафар, метанімій, сінекдах, эпітэтаў, параўнанняў, гіпербал, літот і інш.) у фармаванні мастацкага вобраза. Трыяда мастацкага вобраза (вобраз-індыкатар, вобраз-троп, вобраз-сімвал).

15. Сродкі стварэння вобразнасці (сінонімы, антонімы, адметнае спалучэнне моўных адзінак і інш.). Трансфармацыя моўных адзінак у кантэксце мастацкага твора. Камбінаторнае прырашчэнне сэнсу.

16. Празаічная і паэтычная арганізацыя мастацкага тэксту. Класічная і арнаментальная проза. Празаізацыя вершаванага тэксту і сродкі яе выражэння (дыялагізацыя, словы бытавога зместу і інш.). Паэтызацыя празаічнага тэксту і сродкі яе выражэння (індывідуальна-аўтарскія вобразы, стылістычна афарбаваныя словы і інш.).

17. Асаблівасці сінтаксічнай арганізацыі аўтарскага маўлення і маўлення персанажаў. Сродкі паэтычнага сінтаксісу (анафара, эпіфара, кальцо, паралелізм, градацыя і інш.).

18. Праблема індывідуальнага стылю пісьменніка.

19. Канфесійны стыль. З гісторыі развіцця канфесійнага стылю. Жанры кананічнай, царкоўна-рэлігійнай, рэлігійна-бытавой літаратуры (псалмы, прадмовы, пасляслоўі, акафісты і інш.). Моўныя асаблівасці тэкстаў канфесійнага стылю.

20. Размоўны (гутарковы) стыль. Месца размоўнага стылю ў сістэме функцыяльных стыляў. Жанры размоўнага стылю. Асаблівасці тэкстаў размоўнага стылю на лексічным, марфалагічным, сінтаксічным узроўнях.

21. Лексічнае значэнне слова ў стылістычным аспекце. Словы нейтральныя і стылістычна афарбаваныя. Стылістычныя паметы ў “Тлумачальным слоўніку беларускай мовы” і ў “Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы”. Патэнцыяльная вобразнасць слова.

22. Стылістычная канатацыя лексічных адзінак і яе віды. Словы з эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай, іх разнавіднасці.

23. Словы з функцыянальна-стылістычнай афарбоўкай, іх разнавіднасці.

24. Стылістычнае выкарыстанне з’явы полісеміі (метафара, метанімія, сінекдаха).

25. Стылістычная роля агульнанародных і аўтарскіх параўнанняў.

26. Стылістычная сінаніміка як сістэмна арганізаваная частка слоўніка сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Кантэкстуальныя сінонімы.

27. Стылістычная роля перыфразы як вобразнай адзінкі маўлення. Традыцыйныя і аўтарскія перыфразы.

28. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў.

29. Стылістычнае выкарыстанне амонімаў, паронімаў, іх вобразна-выяўленчыя якасці. Каламбур.

30. Лексіка абмежаванага ўжытку (дыялектная, спецыяльная, жаргонная) і яе стылістычнае выкарыстанне.

31. Устарэлая лексіка (гістарызмы і архаізмы) і яе стылістычнае выкарыстанне.

32. Неалагізмы агульнамоўныя і індывідуальна-аўтарскія, іх стылістычная характарыстыка.

33. Стылістычныя рэсурсы фразеалогіі. Тыпы фразеалагічных адзінак паводле стылістычнай афарбоўкі.

34. Выкарыстанне стылістычна афарбаваных фразеалагічных адзінак у розных функцыянальных стылях. Змяненне і абнаўленне фразеалагізмаў у мастацкай літаратуры і публіцыстыцы.
35. Стылістычныя рэсурсы назоўніка.
36. Стылістычныя рэсурсы прыметніка.
37. Стылістычныя рэсурсы займенніка. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні займеннікаў.
38. Стылістычныя рэсурсы лічэбніка. Стылістычная дыферэнцыяцыя лічэбнікаў розных разрадаў.
39. Стылістычныя рэсурсы дзеяслова і яго формаў.
40. Стылістычныя рэсурсы службовых часцін мовы. Сінанімія прыназоўнікаў.
41. Стылістыка словазлучэнняў. Спалучальнасць моўных адзінак. Сінанімія прыназоўнікавых і беспрыназоўнікавых канструкцый.
42. Стылістыка простага сказа. Стылістычная роля прамога і адваротнага парадку слоў. Памылкі пры інверсійным ужыванні членаў сказа.
43. Стылістыка аднасастаўных сказаў.
44. Стылістыка складанага сказа. Сінанімія злучнікавых і бяззлучнікавых складаных сказаў. Стылістыка спалучальных і падпарадкавальных злучнікаў (і злучальных слоў) у складаных сказах.
45. Паралельныя сінтаксічныя канструкцыі. Сінанімія дзеепрыметных і дзеепрыслоўных словазлучэнняў і даданых частак складанага сказа.
46. Стылістычнае выкарыстанне аднародных членаў сказа, адасобленых слоў і выразаў, устаўных і пабочных канструкцый.
47. Стылістычныя прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення.
48. Стылістыка тэксту як адзін з напрамкаў функцыянальнай стылістыкі. Паняцце структуры тэксту ў лінгвістычных даследаваннях.
49. Структурныя адзінкі тэксту. Празаічная страфа і фрагмент – асноўныя адзінкі тэксту.
50. Звязнасць і цэласнасць тэксту, моўныя сродкі іх выражэння. План зместу і план выражэння.
51. Паняцці ідэі і тэмы. Роля супастаўляльна-стылістычнага метаду аналізу пры характарыстыцы тэмы.
52. Рэалізацыя зместу ў тыпах інфармацыі (фактычнай, канцэптуальнай, падтэкставай).
53. Інтэртэкстуальнасць.
54. Формы славеснага выражэння (вусная і пісьмовая, дыялагічная і маналагічная).
55. Тыпы тэкстаў маналагічнай формы (апавяданне, апісанне, разважанне, азначэнне, тлумачэнне, інструктаванне).
56. Разнавіднасці славеснасці (мастацкая і немастацкая, народная і кніжная).
57. Паняцце моўнай кампазіцыі тэксту. Архітэктоніка. Сюжэт. Фабула.
58. Роля слоўных радоў у моўнай кампазіцыі тэксту.

59. Вобраз аўтара. Тыпізацыя вобраза аўтара.

60. Вобраз апавядальніка.

61. Тыпы мастацкіх тэкстаў па суадносінах “вобраз аўтара – вобраз апавядальніка”.

62. Моўныя і кампазіцыйныя прыёмы суб’ектывацыі аўтарскага аповеду.

63. Асэнсаванне паняцця дыскурсу ў лінгвістычнай літаратуры.

64. Асноўныя школы дыскурс-аналізу.

65. Прыёмы дыскурс-аналізу публіцыстычнага тэксту.

66. Прыёмы дыскурс-аналізу мастацкага тэксту.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| 1. Гісторыя беларускай мовы,<br>2. Культура беларускага маўлення | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі (пратакол № __ ад _________ г.). |